Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар БДУКМ
___________________А. А. Корбут
«____» ______________2017 г.
Рэгістрацыйны № ВД-_____/вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# РЭЖЫСУРА ТЭАТРАЛІЗАВАНЫХ ПРАДСТАЎЛЕННЯЎ І СВЯТ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-17 01 05-02*
*Рэжысура свят (тэатралізаваныя)*

2017

Вучэбная праграма складзена на падставе адукацыйнага стандарту па спецыяльнасці 1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках), зацверджанага і ўведзенага ў дзеянне пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 30.08.2013 г. № 87, вучэбнага плана № С 17-1-53/15 вуч. ад 22.06.2015 г.

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

*А. Я. Камінскі*, загадчык кафедры рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», дацэнт кафедры;

*Г. М. Суліма*, выкладчык кафедры рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*У. А. Мешчанчук*, дэкан тэатральнага факультэта ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў», заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь, прафесар;

*Ю. Д. Пярсідская*, загадчык кафедры рэжысуры эстрады ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 9 ад 29.04.2016 г.);

*навукова-метадычным* саветам установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 22.06.2016 г.)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: А. Я. Камінскі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Рэжысура тэатралізаваных прадстаўленняў і свят» адносіцца да цыкла спецыяльных дысцыплін, прызначаных для падрыхтоўкі рэжысёраў тэатралізаваных прадстаўленняў і свят. Гэта прадугледжвае высокі ўзровень прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў у галіне рэжысуры і драматургіі тэатралізаваных прадстаўленняў і свят, веданне спецыфічных асаблівасцей рэжысуры тэатралізаваных прадстаўленняў.

Асноўныя *мэты* вучэбнай дысцыпліны «Рэжысура тэатралізаваных прадстаўленняў і свят» – фарміраванне ў студэнтаў ведаў у галіне тэарэтычнай і практычнай спадчыны рэжысёрскай школы, заснаванай К. С. Станіслаўскім, У. І. Неміровічам-Данчанка, Я. Б. Вахтангавым, У. Э. Меерхольдам; засваенне спецыфічных асаблівасцей рэжысуры тэатралізаваных прадстаўленняў і свят, характэрных рыс «тэатралізацыі» як мастацкага метаду; пералажэнне жыццёвага дакументальнага матэрыялу ў мастацка-вобразную сцэнічную форму.

Мэтавая накіраванасць вучэбнай дысцыпліны абумоўлівае вырашэнне наступных *задач*:

– выкарыстанне тэхналогій пастановачнай работы ў галіне рэжысуры свят, арганізацыя і правядзенне зводных і генеральнай рэпетыцыі свят, абрадавых тэатралізаваных дзействаў, відовішчаў, гульнявых праграм;

– стварэнне рэжысёрскіх праектаў свята, відовішча, тэатралізаванага абрадавага дзейства, гульнявой праграмы і іх увасабленне на традыцыйнай і нетрадыцыйнай сцэнічнай пляцоўцы ў закрытым памяшканні і на адкрытай прасторы;

– выкарыстанне традыцыйных і новых форм святочнай культуры, напаўненне іх актуальным, запатрабаваным зместам для сучаснікаў;

– стымуляванне інавацыйных кірункаў у рэжысёрска-пастановачнай дзейнасці тэатралізаваных прадстаўленняў, гульнявых, конкурсных, спартыўных праграм і іншых форм святочнай культуры на аснове арыгінальных рэжысёрскіх рашэнняў.

Выкладанне вучэбнай дысцыпліны «Рэжысура тэатралізаваных прадстаўленняў і свят» звязана з выкладаннем іншых вучэбных дысцыплін, сярод якіх: «Прафесійная педагогіка і мето-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дыка выкладання спецдысцыплін», «Асновы рэжысуры і майстэрства акцёра», «Асновы драматургіі і сцэнарнага майстэрства».

Вучэбная дысцыпліна «Рэжысура тэатралізаваных прадстаўленняў і свят» садзейнічае развіццю і фарміраванню наступных груп кампетэнцый спецыяліста.

*Акадэмічныя*:

АК–1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК–4. Умець працаваць самастойна.

АК–5. Быць здольным параджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

АК–9. Умець вучыцца, самастойна павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

*Сацыяльна-асобасныя*:

САК–3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

САК–6. Умець працаваць у камандзе.

САК–7. Быць здольным асэнсавана ўспрымаць і беражліва адносіцца да гістарычнай, культурнай спадчыны Беларусі і свету, культурных традыцый і рэлігійных поглядаў.

*Прафесійныя*:

ПК–1. Ажыццяўляць работу пастановачных груп па арганізацыі і правядзенні розных форм святочнай культуры.

ПК–3. Арганізоўваць работу творчых калектываў падчас правядзення свят для дасягнення пастаўленых мэт і задач.

ПК–4. Рэалізоўваць агульнадзяржаўныя, рэгіянальныя і ведамасныя праграмы і праекты ў галіне культуры.

ПК–5. Выкарыстоўваць нарматыўна-прававую базу галіны культуры.

ПК–8. Праводзіць культурна-асветніцкія мерапрыемствы для выхавання мастацка-эстэтычнага густу ўсіх катэгорый насельніцтва ва ўстановах культуры, спорту, адукацыі і іншых установах.

ПК–11. Кансультаваць кіраўнікоў і ўдзельнікаў творчых, спартыўных, ваенных і іншых калектываў падчас падрыхтоўкі творчых праектаў.

ПК–12. Праводзіць адбор рэпертуару мастацкіх твораў з мэтай захавання і трансляцыі народнай творчасці.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ПК–13. Распрацоўваць і ўвасабляць рэжысёрскія праекты розных святочных форм.

ПК–14. Выкарыстоўваць новыя кірункі ў сучасных рэжысёрскіх тэхналогіях.

ПК–19. Ладзіць арганізацыю і правядзенне маштабных фестываляў на адкрытай прасторы, прысвечаных актуальным пытанням сучаснага грамадства.

ПК–24. Ажыццяўляць навукова-эксперыментальную работу ў галіне рэжысуры свят.

У выніку засваення вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен *ведаць*:

– генезіс, сімволіку і семантыку беларускіх рытуалаў, звычаяў, абрадаў, свят;

– асаблівасці рэжысуры народнага абраду, тэатралізаванага прадстаўлення ў народным свяце;

– методыку распрацоўкі і ўвасаблення рэжысёрскага праекта, сюжэтна-гульнявых і конкурсных праграм, ролевых гульняў;

– методыку фальклорна-этнаграфічнай распрацоўкі абраду і свята;

– традыцыі і навацыі ў творчай арганізацыі свят, новыя напрамкі развіцця сучаснай святочнай культуры Беларусі, асаблівасці рэжысуры свят і фестываляў народнай творчасці, свята горада, вёскі;

– спецыфіку рэжысуры разнажанравых структурных кампанентаў свята;

*умець*:

– увасабляць народны абрад на аснове мясцовых традыцый у закрытым памяшканні і на вольным паветры;

– увасабляць спецыфічны гульнявы комплекс кожнага свята каляндарнага цыкла, сямейна-бытавога традыцыйнага абраду, у тым ліку сучасных сюжэтна-гульнявых і конкурсных праграм, ролевых гульняў;

– ствараць сцэнарна-рэжысёрскую распрацоўку абраду на аснове аўтэнтычнага фальклорна-этнаграфічнага матэрыялу;

– рэалізоўваць сваю мастацкую задуму і арганізаваць мастацка-творчы працэс па стварэнні розных тэатралізаваных або святочных форм;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– праяўляць высокае прафесійнае майстэрства ва ўсіх галінах рэжысёрскай і выканальніцкай дзейнасці, дэманстраваць упэўненасць у валоданні рэжысёрска-пастановачнай тэхналогіяй, веданне гістарычных і сучасных тэхналагічных працэсаў у стварэнні тэатралізаваных і іншых святочных форм, правядзенні даследчай дзейнасці;

– распрацоўваць рэжысёрскі праект свята;

*валодаць:*

– тэхналогіяй увасаблення гульнявой праграмы, абраду, эстраднага нумара, тэатралізаванага прадстаўлення, свята;

– практычнымі навыкамі рэжысуры і выканальніцкага майстэрства, спосабамі ўкаранення разнастайных сродкаў мастацкай выразнасці ў працэс стварэння святочных форм;

– прафесійнымі якасцямі вядучага гульні, тэатралізаванага прадстаўлення, свята.

На засваенне вучэбнай дысцыпліны «Рэжысура тэатралізаваных прадстаўленняў і свят» прадугледжана 1098 гадзін, з якіх 522 – аўдыторныя заняткі: 34 гадзіны – лекцыі, 428 гадзін – практычныя заняткі, 60 гадзін – індывідуальныя. Формы бягучай атэстацыі – залікі, экзамены.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## *Уводзіны*

Прадмет, мэты і задачы дысцыпліны, яе значнасць і месца ў сістэме навучання рэжысёраў тэатралізаваных прадстаўленняў і свят.

Мастацка-выразныя сродкі рэжысуры тэатралізаваных свят і прадстаўленняў. Вобразнае мысленне. Паняцці «мастацтва» і «рамяство». Майстры рэжысуры свят. Асаблівасці рэжысуры масавых свят. Класіфікацыя свят. Сучаснае разуменне, стан, тэндэнцыі развіцця тэатралізаваных форм адпачынку.

## Раздзел І. Рэжысура як творчы працэс

### *Тэма 1. Станаўленне і развіццё рэжысуры як прафесіі*

Нараджэнне рэжысуры як прафесіі. Тэатральная школа К. С. Станіслаўскага і У. І. Неміровіча-Данчанкі. Кніга «Маё жыццё ў мастацтве» К. С. Станіслаўскага.

### *Тэма 2. Асноўныя функцыі рэжысёра*

Восем функцый рэжысёра па вызначэнні К. С. Станіслаўскага, тры функцыі па У. І. Неміровічу-Данчанку. Рэжысёр – аўтар свята, спектакля, фільма. Індывідуальнае бачанне. Прыярытэт рэжысёра. Асоба рэжысёра. Мастацкая пазіцыя. Веданне асноў сумежных прафесій і відаў мастацтва. Майстры рэжысуры тэатра і кіно.

### *Тэма 3. Выхаванне рэжысёрскіх здольнасцей*

Творчыя зачыны. Дзённікі назіранняў, праглядаў і ўражанняў. Рэжысёрскія практыкаванні на музычную тэму, верш, малую празаічную форму.

### *Тэма 4. Мізансцэна – мова рэжысёра*

Паняцце тэрміна «мізансцэна». Прасцэніум. Сцэнічныя планы. Паняцці «лева» і «права» на сцэне. Мізансцэнічная вось. Мізансцэнічны «флюз». Перспектыва на сцэне. Труакар. Спінныя і паўспінныя мізансцэны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 5. Сцэнічная атмасфера. Творы жывапісу, скульптуры, графікі, мастацкай фатаграфіі як аснова для эцюдаў і практыкаванняў*

Вывучэнне сусветнай мастацкай спадчыны. Розныя кірункі жывапісу, скульптуры, графікі, мастацкай фатаграфіі. Выбар асобы і твораў мастака, скульптара, фатографа. Работа над сцэнічным увасабленнем задумы. Эцюдны метад рэпетыцыі. Мастацка-дэкаратыўнае і музычна-шумавое афармленне эцюда.

## Раздзел ІІ. Тэатралізаванае прадстаўленне як структурная адзінка свята

*Тэма 6. Тыпалогія тэатралізаваных і святочных дзей*

Сутнасць паняццяў «тэатралізаванае прадстаўленне», «свята», «відовішча», «тэатралізаваны канцэрт», «шоу». Тэатралізаванае прадстаўленне – творчае асэнсаванне рэчаіснасці, фактаў, музычнай, харэаграфічнай, дакументальнай, мастацкай інфармацыі, ператварэнне іх у тэатр, наданне феномена, не маючаму адносін да тэатра, гульнявых і ролевых рыс. Відовішча – сцэнічнае дзеянне, якое прываблівае свядомасць пры дапамозе візуальнасці. Шоу-праграма – забаўляльнае мерапрыемства пастановачнага характару.

Тыпалогія прадстаўленняў як самастойных відовішчных форм. Тэатралізаванае прадстаўленне – сцэнічнае дзеянне, аб'яднанае адзінай думкай, у якім мантажна спалучаюцца ўсе віды, жанры літаратуры і мастацтва. Публіцыстычныя, святочныя, дзіцячыя, эстрадныя прадстаўленні, прадстаўленні-капуснікі, прадстаўленні-кірмашы, прадстаўленні-канцэрты, агітпрадстаўленні.

Прадстаўленне як цэнтральная частка свята, яго адметныя рысы і выразныя сродкі. Асноўныя этапы работы над стварэннем тэатралізаванага прадстаўлення ў свяце. Пошук сцэнарна-рэжысёрскага ходу прадстаўлення. Выразныя сродкі тэатралізаванага прадстаўлення.

*Тэма 7. Тэатралізаванае прадстаўленне на аснове падрыхтаваных нумароў*

Рэжысёрская задума і літаратурна-рэжысёрская распрацоўка тэатралізаванага прадстаўлення на аснове разнажанравых ну-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

showing мароў. Структура, сцэнарна-рэжысёрскі ход, архітэктоніка і жанр тэатралізаванага прадстаўлення. Вызначэнне звышзадачы, скразнога дзеяння, рэжысёрскіх эпізодаў, мастацкага вобраза тэатралізаванага прадстаўлення ў мастацка-дэкаратыўным, музычным і пластычным вырашэннях. Застольныя, планіровачныя, мантажныя, зводныя і генеральная рэпетыцыі.

Тэарэтычная распрацоўка тэатралізаванага прадстаўлення: складанне праграмы, агульнага сцэнарнага плана, літаратурнага сцэнарыя, правядзенне рэжысёрскага і тэхналагічнага аналізу сцэнарыя, выяўленне рэжысёрскай эксплікацыі (бачання) увасабляемага дзейства, стварэнне арганізацыйна-вытворчага плана па творчым, матэрыяльна-тэхнічным, арганізацыйным і фінансавым увасабленні.

Практычнае ўвасабленне тэатралізаванага прадстаўлення: пастаноўка тэатралізаванага прадстаўлення (дапрацоўка ці перапрацоўка нумароў у адпаведнасці з агульнай задумай); стварэнне новых нумароў, неабходных для ўвасаблення рэжысёрскай задумы; складанне музычнай, светлавой і пластычнай партытур; запіс фанаграм; выраб элементаў мастацка-дэкаратыўнага афармлення, падрыхтоўка сцэнічных касцюмаў, рэквізіту і бутафорыі; арганізацыя і правядзенне рэпетыцыйнага працэсу; паказ прадстаўлення перад гледачамі.

### *Тэма 8. Рэжысура і арганізацыя сучаснага абраду, тэатралізаванага фальклорнага прадстаўлення*

Вытокі абраднасці. Выкарыстанне фальклорных гульнявых традыцый у сучасным абрадзе. Тэатралізаванае фальклорнае прадстаўленне ў сучасных святах на аснове твораў вусна-паэтычнай творчасці, гістарычных падзей, абрадава-гульнявога дзеяння. Абрад як відовішчная частка свята. Мантаж сцэнічнага абрадавага дзеяння на аснове рытуалу. Стылізацыя традыцыйнага абраду. Паняцці «рэстаўрацыя», «рэканструкцыя», «трансфармацыя». Рэжысёрскі аналіз сцэнічнай формы абраду. Асаблівасці творчага вырашэння і арганізацыі абрадавага прадстаўлення ў сцэнічных умовах. Мастацкі вобраз абрадавага прадстаўлення ў мастацка-дэкаратыўным, музычным і пластычным увасабленнях. Прасторавае вырашэнне абраду ў сцэнічных умовах. Распрацоўка сістэмы вобразаў тэатралізаванага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абраду. Пералажэнне масава-гульнявога традыцыйнага абрадавага дзейства ў сцэнічную мастацка-відовішчную форму.

*Тэма 9. Работа рэжысёра з дакументальным матэрыялам*

Паняцце «дакумент». Дакументальнае дзеянне. Рэканструкцыя падзей. Дакументальны вобраз. Рэальны герой – аснова дакументальнага прадстаўлення, масавага свята. Этапы работы рэжысёра з дакументальным матэрыялам: вывучэнне, адбор матэрыялу; рэжысёрская задума, напісанне сцэнарыя; застольны рэпетыцыйны перыяд; рэпетыцыя ў выгарадках. Музычна-шумавое вырашэнне прадстаўлення (падбор музыкі і шумоў, драматургія гукарада). Работа над стварэннем тэмпарытмічнага малюнка, атмасферы.

*Тэма 10. Рэжысура эстраднага прадстаўлення*

Тэрмін «эстрада». Асаблівасці рэжысуры эстрады. Гісторыя ТЭРЭВСАТа (тэатр рэвалюцыйнай сатыры), «синеблузники». Эстрада 20-х гг. XX ст. Жанры эстрадных нумароў (размоўны, вакальны, харэаграфічны, эстрадна-цыркавы, арыгінальны).

Асаблівасці тэатральных школ: К. С. Станіслаўскі, У. І. Неміровіч-Данчанка – «мастацтва перажывання»; У. Э. Меерхольд, Я. Б. Вахтангаў – «мастацтва прадстаўлення»; М. Чэхаў, Е. Гратоўскі – псіхафізіка і імправізацыя; Б. Брэхт – тэатр адчужэння.

Паняцці «ілюстрацыя», «тэатралізацыя».

Паняцці «стыль», «аўтарскі стыль», «стылявыя напрамкі», «штамп». Сувязь стылю і рэжысёрскага метаду ўвасаблення нумара.

*Тэма 11. Мастацкая структура нумара*

Паняцце «нумар». Нумар як адзінка тэатралізаванага прадстаўлення. Тыпалогія канцэртных нумароў. Рэжысёрскі нумар. Структура сцэнічнага эцюда, канцэртнага нумара і мініяцюры. Адрозненні і агульныя выразныя сродкі і элементы ў сцэнічных творах.

*Тэма 12. Нумары размоўнага жанру*

Тыпы размоўнага жанру і іх асаблівасці (монаспектакль, мініяцюра, маналог «у вобразе», канферанс, фельетон, скетч,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інтэрмедыя, сцэнка, эстрадны дыялог, эстрадна-бытавы расказ, пародыя, бурымэ). Тыпы нумароў музычна-размоўнага жанру: куплет, шансанетка, прыпеўка, музычны фельетон.

*Тэма 13. Нумары вакальна-эстраднага, пластыка-харэаграфічнага жанру ў структуры прадстаўлення*

Песня на эстрадзе. Асаблівасці мікрафонных спеваў, a capella, народныя спевы, раманс, балада, жартоўная песня, прыпеўка, патрыятычная песня, лірычная песня.

Характэрныя асаблівасці харэаграфічнай мініяцюры, эстраднага танца, сімфанічнага танца, пантамімы.

*Тэма 14. Стварэнне нумара на аснове літаратурнай крыніцы, твора вусна-паэтычнай творчасці*

Шляхі пераладжэння літаратурнага, вусна-паэтычнага матэрыялу ў сцэнічны твор (легенды, паданні, байкі, песні). Этапы рэжысёрскай распрацоўкі і даследавання літаратурнай крыніцы, вусна-паэтычнага твора. Музычнае вырашэнне нумара. Мастацка-дэкаратыўнае вырашэнне нумара. Пластычнае вырашэнне нумара. Арганізацыя рэпетыцыйнага працэсу. Этапы інсцэнізацыі песні. Асаблівасці рэжысуры нумара на эстрадзе і ў тэатралізаваным прадстаўленні.

*Тэма 15. Эстрадна-цыркавыя, арыгінальныя нумары на аснове гратэскавых форм*

Тыпы эстрадна-цыркавых нумароў: эквілібрыстыка, жангліраванне, ілюзіён, эксцэнтрыка, акрабатыка і інш. Віртуозная тэхніка валодання трукамі ў адзінстве з пластыкай, спевамі, танцам, словам, музыкай.

Паняцце «гратэск», гісторыя яго ўзнікнення і развіцця. Алегарычная пантаміма, скульптура, жывапіс, байка, верш. Гратэскавы метад пабудовы вобразаў у міфалогіі і мастацтве народаў свету. Месца гратэску ў нумары. Выяўленне смешнага ў нумары.

*Тэма 16. Пантаміма і клаўнада на эстрадзе. Стварэнне лялечнага нумара*

Пантаміма – мастацтва сцэнічнага дзеяння, выражэнне цела ў пластыцы без слоў. Пантаміма: класічная, філасофская, па



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

творах мастакоў-карыкатурыстаў; буфанада, клаўнада, музычная эксцэнтрыка. Клаўнада як асобая форма гратэску. Роля імправізацыі ў пастаноўцы нумара клаўнады.

Вытокі лялечнага тэатра. Беларуская батлейка як тып народнага відовішча. Прынцыпы пабудовы лялечных жанравых сцэн у адзіную кампазіцыю. Лялька на эстрадзе. Разнавіднасці лялек (пальцавыя, пяльчаткавыя, палкавыя, роставыя). Вентралогія, імітацыя, гукаперайманне.

*Тэма 17. Пастановачная работа па ўвасабленні нумара*

Застольны перыяд як пачатковы этап творчага ўвасаблення нумара. Раскрыццё агульных мастацкіх рыс будучага нумара. Тэма і ідэя. Чытанне літаратурнага сцэнарыя або інсцэнізацыі твора, размяркоўванне роляў паміж выканаўцамі. Рэжысёрская характарыстыка дзеючых асоб. Чытанне сцэнарыя па ролях. Вызначэнне сэнсу ўчынкаў кожнага персанажа, яго адносін да падзей, канфлікту і іншых персанажаў, раскрыццё падтэксту, унутранага маналогу і другога плана дзеючых асоб. Планіровачныя рэпетыцыі ў прадметным асяроддзі (сталы, крэсла, лавы і г. д.), якія ўмоўна мадэлююць мастацка-дэкаратыўнае афармленне будучага нумара. Мантажная рэпетыцыя як тэхнічнае рашэнне нумара. Вызначэнне месцаў размяшчэння ўсіх відаў тэхнічнай апаратуры. Тэхнічнае вырашэнне і пастаноўка гукавога і светлавога абсталявання нумара. Удакладненне месца, часу і спосабаў тэхнічных перастановак. Агляд мастацка-дэкаратыўнага афармлення ў поўным аб'ёме, касцюмаў і грыму персанажаў на фоне святла. Тэхнічныя прагоны нумара пад фанаграму. Прагон нумара як сінтэз яго творчых і тэхнічных кампанентаў. Карэкцыя дзеянняў творчых і тэхнічных выканаўцаў. Генеральная рэпетыцыя нумара як завяршальны этап работы рэжысёра над нумарам, прагон дзейства з усімі дадатковымі сродкамі выразнасці. Карэкціровачная рэпетыцыя як улік выказаных заўваг і выпраўленне выяўленых недахопаў. Здача і паказ нумара перад гледачамі.

*Тэма 18. Канцэрт – як форма эстраднага прадстаўлення.*
*Віды і жанры канцэртаў.*
*Асаблівасці рэжысуры тэатралізаванага канцэрта*

Тэрмін «канцэрт». Віды канцэрта: сольны, монаканцэрт, зборны, справаздачны, акадэмічны альбо філарманічны, камер-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ны, сімфанічны, дзіцячы, тэматычны, рэвю, тэатралізаваны, канцэрт народнай творчасці, эстрадны, гала-канцэрт, шоу. Рэжысура канцэртнай праграмы: разнастайнасць нумароў, улік тэматычнага спалучэння нумароў. Вызначэнне месца нумара ў праграме. Асаблівае значэнне пачатковых і фінальных нумароў. Дакладнасць пераходу ад нумара да нумара. Працягласць нумароў. Мастацкі вобраз у тэатралізаваным канцэрце. Асноўныя (гендарныя, тэмпарытмічныя) заканамернасці складання канцэртных праграм.

Канцэрт на стадыёне. Улік тэхнічнага абсталявання выступленняў (інструменты, станкі і падстаўкі, цыркавое і спартыўнае абсталяванне).

*Тэма 19. Выразныя сродкі рэжысуры канцэрта*

Відэасюжэты і відэаінсталяцыя (работа з экранамі і манітора-мі). Харэаграфічныя, цыркавыя і пластычныя фонавыя групы. Асвятляльныя і лазерныя эфекты. 3D-мапінг. Музычныя паўзы. Сцэнаграфічнае рашэнне канцэрта. Работа рэжысёра з мастаком. Сюжэтны ход, ролевая персаніфікацыя, сцэнаграфія, відэасюжэты, касцюміраванне – асноўныя спосабы тэатралізацыі. Мастацка-сэнсавыя блокі. Тэатралізаваныя пралог і фінал. Саўндтрэк. Манціровачныя рэпетыцыі. Зводныя, прагонныя рэпетыцыі. Вядучы (вядучыя) канцэрта і яго функцыі. Канферанс і канферансье. Разнастайнасці канферанса. Голас «па-за кадрам». «Non-стоп».

*Тэма 20. Этапы пастаноўкі канцэртнай праграмы*

Прагляд і адбор нумароў. Ініцыяцыя іх стварэння ў выпадку мастацкай неабходнасці. Рэжысура нумара і работа з кіраўнікамі мастацкіх калектываў. Аб’яднанне нумароў у мастацка-сэнсавыя блокі. Блокавая арганізацыя канцэртнага відовішча. Бесперапыннасць канцэртнай дзеі (супер-заслона, светлавая заслона, дадатковыя пляцоўкі, выкарыстанне валанцёраў-машыністаў сцэны). Уваход на сцэну і выхад з яе масавых калектываў. Асаблівасці рэпетыцыйнай працы. Завочны рэжысёрскі рэпетыцыйны працэс. Інтэрактыўная рэжысура нумароў. З’ява «самарэжысуры» і «хатняй рэжысуры» ў канцэртнай творчасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 21. Planіровачнае вырашэнне дзейства*

Мізансцэна як адлюстраванне канфлікту, тэмпарытму, атмасферы. Спосабы запісу мізансцэн. Віды і характарыстыка мізансцэн розных відаў, іх выразных магчымасцей і недахопаў (франтальныя, дыяганальныя, кругавыя, кальцавыя, цэнтраімкненныя, цэнтрабежныя, сіметрычная, асіметрычная). Улік асаблівасцей успрымання мізансцэны гледачамі. Вузлавыя цэнтральныя мізансцэны. Апорная, пераходная, фінальная мізансцэны. Асаблівасці работы рэжысёра над масавай мізансцэнай. Мізансцэнічная рыфма.

*Тэма 22. Мантаж і яго асноўныя функцыі. Прыёмы мантажу*

Паняцце «мантаж». Мантажнае спалучэнне мантажных кампанентаў у цэласную мастацкую кампазіцыю. Мантаж у кіно, драматургіі і тэатралізаваным прадстаўленні. Асноўныя тыпы мантажу (паслядоўны, паралельны, асацыятыўны). Мантаж атракцыёнаў (па С. Эйзенштэйну). Мантажны план. Мантажны ліст.

*Тэма 23. Новыя формы і сучасныя тэхналогіі ў рэжысуры тэатралізаваных прадстаўленняў і свят*

Перформанс. Хэпенінг. Флэшмоб. Відэакантэнт. Відэадызайн. Відэамэпінг (3D-мэпінг). Камп'ютарная графіка. Піратэхніка. Лазерныя эфекты. Дакументальнае кіно і відэасюжэты як выразны сродак тэатралізаваных прадстаўленняў.

## Раздзел III. Тэарэтычныя і практычныя асновы рэжысуры тэатралізаваных прадстаўленняў і свят

*Тэма 24. Фарміраванне задумы і кампазіцыя тэатралізаванага прадстаўлення, масавага свята*

Рэжысёрская задума свята як сістэма вызначэння асноўных пачатковых кампанентаў стварэння святочнага дзеяння. Змест і накіраванасць кампанентаў рэжысёрскай задумы свята.

Рэжысура як ідэйна-тэматычнае тлумачэнне сцэнарыя, арганізацыя дзеяння ў прадстаўленні, праца з выканаўцамі і ўдзельнікамі свята. Рэжысёрская рэалізацыя канфлікту. Праца рэжысёра з кампазітарам, мастаком, харэографам, драматургам. Устанаўленне агульнага разумення ідэйна-мастацкай сутнасці, увасобленай у пластычным, дэкаратыўным, музычным выра-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шэнні прадстаўлення, свята. Ідэйны і псіхалагічны змест масавага свята. Выразныя сродкі ў свяце.

Пастановачны план свята і яго структура.

*Тэма 25. Мастацкі вобраз свята*
*і яго адлюстраванне ў музычным, пластычным*
*і архітэктурна-дэкаратыўным вырашэннях свята*

Мастацкі вобраз – форма метафарычнага мыслення ў мастацтве, якая раскрывае адну з'яву праз другую. Шматзначнасць, багацце, глыбіня мастацкага вобраза і яго індывідуалізаваны характар («агульнае праяўляецца ў індывідуальным і праз індывідуальнае», Ю. Бораў). Недагаворанасць мастацкага вобраза відовішча (прынцып nonfinito) – шлях да абуджэння творчай фантазіі гледача. Грунтоўнае спасціжэнне тэмы і асацыятыўнае мысленне рэжысёра – шлях да знаходжання і фіксацыі мастацкага вобраза пастаноўкі. Вербальнае вызначэнне мастацкага вобраза пастаноўшчыкам. Пошукі ўвасаблення мастацкага вобраза ў архітэктурна-дэкаратыўным, музычным і пластычным вырашэннях свята. Гарманічнае спалучэнне элементаў рэжысёрскага вырашэння – шлях да ўвасаблення мастацкага вобраза відовішча.

*Тэма 26. Выканаўца тэатралізаванага відовішча.*
*Прыёмы актывізацыі аўдыторыі і іх выкарыстанне*
*ў святах, прадстаўленнях*

Характарыстыка чатырох груп выканаўцаў: акцёр-выканаўца мастацкай часткі свята і прадстаўлення; мастацкія калектывы і салісты; рэальны герой; аўдыторыя. Асаблівасці рэжысёрскай працы з кожнай з груп.

Далучэнне патэнцыяльнай аўдыторыі ў падрыхтоўку прадстаўлення, свята як спосаб яе актывізацыі. Дыферэнцыраваныя тэхналогіі і асноўныя прыёмы актывізацыі глядацкай аўдыторыі: арганізацыя рэальнага сімвалічнага і рытуальнага дзеяння, стварэнне гульнявой сітуацыі, калектыўнае выкананне песень, танцаў, фізічных практыкаванняў, арганізацыя садзейнічання героям тэатралізаванага прадстаўлення.

*Тэма 27. Асаблівасці рэжысуры масавых сцэн*
*у тэатралізаваным прадстаўленні і масавым свяце*

Пастаноўка масавых сцэн у прадстаўленні, свяце. Творчы і тэхналагічны аспекты пастановачнай работы. Рэжысёрскія



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прынцыпы мізансцэніравання ў тэатралізаваным святочным дзеянні на стадыёне, плошчы, вадзе і г. д.

Масавая сцэна як яскравы выразны сродак свята і адлюстраванне найбольш значных ідэй і пачуццяў мастацкага відовішча. Рэжысёрская задума масавых сцэн свята, прадстаўлення. Самастойная работа рэжысёра па падрыхтоўцы буйнамаштабных сцэн. Інструктаж членаў пастановачнай групы свята і работа з арганізацыямі, зацікаўленымі ў правядзенні свята. «Штабныя гульні» з членамі пастановачнай групы перад правядзеннем рэпетыцый. Асаблівасці правядзення рэпетыцый масавых сцэн свята, прадстаўлення. Тэхналогія пастаноўкі буйнамаштабных масавых фіналаў у канцэртах і тэатралізаваных прадстаўленнях.

*Тэма 28. Арганізацыя рэпетыцыйнага працэсу святочных дзей. Віды рэпетыцый і іх функцыянальная накіраванасць*

Рэпетыцыя як творчы сумесны працэс рэжысёра з выканаўцамі розных відаў работ па падрыхтоўцы, папярэдняй распрацоўцы і ўвасабленні розных святочных дзей. Віды рэпетыцый і іх характарыстыка. Парадак правядзення і змест рэпетыцый. Асаблівасці работы рэжысёра з рознымі катэгорыямі ўдзельнікаў свята: аматарамі, прафесіяналамі, а таксама спецыфічнымі групамі выканаўцаў

Трыадзінства асобы рэжысёра па вызначэнні У. І. Немірові-ча-Данчанкі. Арганізацыйныя і педагагічныя функцыі пастаноўшчыка падчас работы з аматарскімі калектывамі і выканаўцамі. Работа з прафесійнымі артыстамі і калектывамі. Пастановачная работа са спецыфічнымі групамі выканаўцаў: вайскоўцамі, спартсменамі, падлеткавымі, дзіцячымі калектывамі, з дзецьмі, маючымі адхіленні ў псіхафізічным развіцці.

*Тэма 29. Прасторавыя і часовыя асаблівасці масавага свята*

Паліфанічнасць і адначасовасць развіцця святочнага дзеяння. Выкарыстанне архітэктурных і ландшафтных прыродных асаблівасцей мясцовасці пры вызначэнні асноўных зон дзеяння свята. Прастора сцэнічная, відовішчная, ігравая зона, узаемадзеянне мастацкага фону і выканаўцы (акцёра).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 30. Асаблівасці рэжысуры тэатралізаваных відовішчаў на тэрыторыі мемарыяльных комплексаў і гістарычных помнікаў*

Беларусь – краіна замкаў. Гістарычнае архітэктурнае асяроддзе відовішча як паўнавартасны кампанент святочнай кампазіцыі. Дзяржаўная праграма «Замкі Беларусі» і дзейнасць устаноў культуры па захаванні нацыянальных гістарычных каштоўнасцей. Спалучэнне старажытнага асяроддзя і сучасных мультымедыйных тэхналогій як сродак змянення мастацкай парадыгмы відовішча. Спецыфіка пастановачнай работы ў асяроддзі гістарычных помнікаў і мемарыяльных комплексаў.

*Тэма 31. Асаблівасці рэжысуры свят сучаснага горада і вёскі*

Асаблівасці рэжысуры свята ў горадзе поліфанічнай накіраванасці: стварэнне свята на дакументальнай аснове, размеркаванне святочных пляцовак у традыцыйных месцах святкавання. Вызначэнне галоўнай і другарадных сцэнічных пляцовак свята. Пераважная кампазіцыйная пабудова свята з яго пачаткам, кульмінацыяй і завяршэннем у адным месцы (на галоўнай пляцоўцы) і развіццём святочнай дзеі на другарадных сцэнічных пляцоўках. Стварэнне відовішчных і масава-гульнявых зон дзеяння свята. Арганізацыя самаакупных святочных дзей (прадстаўленні, канцэрты, гульнявыя латарэі і інш.).

Асаблівасці рэжысуры свята вёскі: стварэнне традыцыйнага месца святкавання; распрацоўка паэтапнага ўвасаблення свята ў адным месцы; увасабленне свята ў масава-гульнявой форме. Выкарыстанне ў свяце мясцовага фальклорна-этнаграфічнага матэрыялу, творчых калектываў, твораў сучасных мясцовых аўтараў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | практычныя заняткі | індывідуальныя заняткі | | |
| | ***Уводзіны*** | 2 | | | | |
| **Раздзел I. Рэжысура як творчы працэс** | | | | | | |
| 1. | Станаўленне і развіццё рэжысуры як прафесіі | 2 | 4 | | | |
| 2. | Асноўныя функцыі рэжысёра | | 4 | | | |
| 3. | Выхаванне рэжысёрскіх здольнасцей | | 6 | 2 | | |
| 4. | Мізансцэна – мова рэжысёра | | 4 | 4 | 10 | прагляд эцюдаў |
| 5. | Сцэнічная атмасфера. Творы жывапісу, скульптуры, графікі, мастацкай фатаграфіі як аснова для эцюдаў і практыкаванняў | | 16 | 2 | | |
| **Раздзел II. Тэатралізаванае прадстаўленне як структурная адзінка свята** | | | | | | |
| 6. | Тыпалогія тэатралізаваных і святочных дзей | 2 | 8 | | 6 | канспект |
| 7. | Тэатралізаванае прадстаўленне на аснове падрыхтаваных нумароў | | 18 | 4 | 8 | прагляд нумароў |
| 8. | Рэжысура і арганізацыя сучаснага абраду, тэатралізаванага фальклорнага прадстаўлення | | 18 | 4 | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 9. | Работа рэжысёра з дакументальным матэрыялам | | 20 | 4 | 14 | даклад |
| 10. | Рэжысура эстраднага прадстаўлення | | 6 | | | |
| 11. | Мастацкая структура нумара | | 18 | 4 | | |
| 12. | Нумары размоўнага жанру | 2 | 14 | 2 | | |
| 13. | Нумары вакальна-эстраднага, пластыка-харэаграфічнага жанру ў структуры прадстаўлення | 2 | 14 | 2 | 6 | прагляд нумароў |
| 14. | Стварэнне нумара на аснове літаратурнай крыніцы, твора вусна-паэтычнай творчасці | | 6 | 2 | 4 | прагляд нумароў |
| 15. | Эстрадна-цыркавыя, арыгінальныя нумары на аснове гратэскавых форм | | 10 | 2 | 8 | даклад |
| 16. | Пантаміма і клаўнада на эстрадзе. Стварэнне лялечнага нумара | | 20 | 4 | 6 | даклад |
| 17. | Пастановачная работа па ўвасабленні нумара | | 16 | | | |
| 18. | Канцэрт – як форма эстраднага прадстаўлення. Віды і жанры канцэртаў. Асаблівасці рэжысуры тэатралізаванага канцэрта | 2 | 4 | | 12 | даклад |
| 19. | Выразныя сродкі рэжысуры канцэрта | | 10 | | | |
| 20. | Этапы пастаноўкі канцэртнай праграмы | | 22 | 4 | | |
| 21. | Планіровачнае вырашэнне дзейства | | 6 | 2 | | |
| 22. | Мантаж і яго асноўныя функцыі. Прыёмы мантажу | 2 | 6 | | | |
| 23. | Новыя формы і сучасныя тэхналогіі ў рэжысуры тэатралізаваных прадстаўленняў і свят | 2 | 10 | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Раздзел III. Тэарэтычныя і практычныя асновы рэжысуры тэатралізаваных прадстаўленняў і свят** | | | | | | |
| 24. | Фарміраванне задумы і кампазіцыя тэатралізаванага прадстаўлення, масавага свята | | 12 | 4 | | |
| 25. | Мастацкі вобраз свята і яго адлюстраванне ў музычным, пластычным і архітэктурна-дэкаратыўным вырашэннях свята | 2 | 18 | 2 | | |
| 26. | Выканаўца тэатралізаванага відовішча. Прыёмы актывізацыі аўдыторыі і іх выкарыстанне ў святах, прадстаўленнях | | 10 | 4 | 12 | рэферат |
| 27. | Асаблівасці рэжысуры масавых сцэн у тэатралізаваным прадстаўленні і масавым святце | | 18 | | 12 | рэферат |
| 28. | Арганізацыя рэпетыцыйнага працэсу святочных дзей. Віды рэпетыцый і іх функцыянальная накіраванасць | 2 | 4 | | 6 | даклад |
| 29. | Прасторавыя і часовыя асаблівасці масавага свята | | 2 | | | |
| 30. | Асаблівасці рэжысуры тэатралізаваных відовішчаў на тэрыторыі мемарыяльных комплексаў і гістарычных помнікаў | | 10 | 4 | | |
| 31. | Асаблівасці рэжысуры свят сучаснага горада і вёскі | | 4 | 4 | | |
| | **Усяго…** | 20 | 338 | 60 | 104 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### Літаратура

*Асноўная*

*Богданов, И. А.* Постановка эстрадного номера / И. А. Богданов. – СПб. : СПбГАТИ, 2004. – 332 с.

*Борисов, С. К.* Основы драматургии театрализованного действа : учеб. пособие / С. К. Борисов ; Челяб. гос. акад. культуры и искусств. – 4-е изд. – Челябинск, 2011. – 207 с.

*Генкин, Д. М.* Массовые праздники : учеб. пособие для студентов ин-тов культуры / Д. М. Генкин. – М. : Просвещение, 1975. – 140 с. : ил.

*Глан, Б. Н.* Праздник всегда с нами / Б. Н. Глан. – М. : Союз театральных деятелей РСФСР, 1988. – 189 с.

*Гуд, П. А.* Ад Каляд да Пакроваў / П. А. Гуд ; рэд.-склад. Л. І. Жук. – Мінск : Красіка-Прынт, 2000. – 223 с. – (Беларусь святочная).

*Гуд, П. А.* Беларускі кірмаш / П. А. Гуд, Н. І. Гуд. – Мінск : Полымя, 1996. – 268 с.

*Гуд, П. А.* Тэхналогія стварэння свята : вучэб. дапам. / П. А. Гуд. – 2-е выд., стэрэатып. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – 224 с.

*Камінскі А. Я.* Зімовыя святы / А. Я. Камінскі. – Мінск : Чатыры чвэрці, 2009. – 140 с.

*Камінскі, А. Я.* Рэжысура традыцыйнага абраду : вучэб.-метад. дапам. / А. Я. Камінскі. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009. – 112 с.

*Клитин, С.* Искусство эстрады XIX–XX вв. / С. Клитин. – СПб. : СПбГАТИ, 2005. – 472 с.

*Конович, А. А.* Театрализованные праздники и обряды в СССР / А. А. Конович. – М. : Высш. шк., 1990. – 206 с.

*Марков, О. И.* Сценарно-режиссерские основы художественно-педагогической деятельности клуба : учеб. пособие для студентов ин-тов культуры / О. И. Марков. – М. : Просвещение, 1988. – 158 с.

*Маршак, М. И.* Кто придумал вечер? Заметки о клубном творчестве / М. И. Маршак. – М. : Сов. Россия, 1988. – 112 с.

Массовые праздники и зрелища : сб. / сост. Б. Н. Глан. – М. : Искусство, 1961. – 327 с.

Мастерство режиссера / под общей ред. Н. А. Зверевой. – М. : ГИТИС, 2007. – 534 с.

*Мочалов, Ю.* Композиция сценического пространства. Поэтика мизансцены : учеб. пособие для учеб. заведений культуры / Ю. Мочалов. – М. : Просвещение, 1981. – 238 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Орлов, О. Л.* Праздничная культура России / О. Л. Орлов ; С.-Петерб. гос. ун-т культуры и искусств. – СПб., 2001. – 160 с.

*Орлов, О. Л.* Теоретические аспекты изучения праздничной культуры России / О. Л. Орлов. – СПб. : Изд. СПбГУКИ, 2001.

*Овсянников, С. А.* Зрелищность и выразительность театрализованного представления / С. А. Овсянников. – СПб., 2003. – 376 с.

*Пави, П.* Словарь театра / П. Пави. – М. : ГИТИС, 2003. – 504 с.

*Рябков*, *В. М.* Антология форм праздничной и развлекательной культуры России (первая половина XX в.) : учеб. пособие / В. М. Рябков ; Челяб. гос. академия культуры и искусств. – Челябинск : Полиграф-Мастер, 2007. – Т. 4. – 870 с.

*Сегал, М. Д.* Физкультурные праздники и зрелища / М. Д. Сегал. – М. : Физкультура и спорт, 1977. – 187 с.

*Силин, А. Д.* Площади – наши палитры (Специфика работы режиссера при постановке массовых театр. представлений под открытым небом и на нетрадиц. сцен. площадках) / А. Д. Силин. – М. : Сов. Россия, 1982. – 184 с. : ил.

Театрализованное представление в массовом празднике-юбилее города : метод. пособие / Минский ин-т культуры ; авт.-сост. Ю. М. Черняк. – Минск, 1989. – 32 с.

*Тихомиров, Д. В.* Беседы о режиссуре театрализованных представлений / Д. В. Тихомиров. – М. : Сов. Россия, 1976. – 234 с.

*Туманов, И. М.* Режиссура массового праздника и театрализованного концерта : учеб. пособие для ин-тов культуры / И. М. Туманов. – М. : Просвещение, 1976. – 86 с.

*Черняк, Ю.М.* Режиссура праздников и зрелищ : учеб. пособие для студентов / Ю. М. Черняк. – Минск : ТетраСистемс, 2004. – 223 с.

*Чечетин, А. И.* Искусство театрализованных представлений / А. И. Чечетин. – М. : Сов. Россия, 1988. – 136 с.

*Шароев, И. Г.* Музыка, которую мы видим / И. Г. Шароев. – М. : Сов. композитор, 1990. – 256 с. : ил.

*Шароев, И. Г.* Театр народных масс / И. Г. Шароев. – М. : ГИТИС, 1978. – 123 с.

*Шароев, И. Г.* Режиссура эстрады и массовых представлений : учебник для студентов театр. высш. учеб. заведений / И. Г. Шароев. – Изд. 3-е, испр. – М. : РАТИ-ГИТИС, 2009. – 336 с

*Шубина, И. Б.* Драматургия и режиссура зрелища : Игра, сопровождающая жизнь : учеб.-метод. пособие / И. Б. Шубина. – Ростов н/Д : Феникс, 2006. – 288 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатковая*

*Генкин, Д. М.* Массовые театрализованные праздники и представления : учеб.-метод. пособие / Д. М. Генкин ; Всесоюз. науч.-метод. центр нар. творчества и культпросвет. работы. – М., 1985. – 87 с.

*Гуд, П. А.* Мастацтва феерверкаў : (вогненна-светлавыя дзеі народаў свету) / П. А. Гуд. – Мінск : Мэджик Бук, 2007. – 99 с.

*Макаров, С. М.* Театрализация цирка / С. М. Макаров. – М. : Изд. Книжный дом «ЛИБРОКОМ», 2010. – 288 с.

*Огаркова, Н. А.* Церемонии, празднества, музыка русского двора. XVIII – начало XIX века / Н. А. Огаркова. – СПб. : Дмитрий Буланин, 2004. – 145 с.

*Панфилов, В. В.* Режиссеру праздника об игре / В. В. Панфилов. – М. : ВЦХТ, 2004. – 176 с.

*Розовский, М. Г.* Режиссер зрелища / М. Г. Розовский. – М., 1973.

*Рубб, А. А.* Эстрада с точки зрения… Беседы режиссера / А. А. Рубб. – М. : ГРДНТ, 1993. – 259 с.

*Самойленко, В. М.* Массовые музыкальные представления: Театрализованный концерт: Опыт. Тенденции развития / В. М. Самойленко. – М. : Музыка, 1989. – 144 с.

*Скрипина, Н. В.* Прикладная хореография в театрализованном представлении и празднике: учеб. пособие / Н. В. Скрипина ; Челяб. гос. акад. культуры и искусств. – Челябинск, 2008. – 160 с. : ил.

Создание концертного номера на основе гротесковых форм : метод. указания для студентов специализации «режиссер массовых праздников» / Минский ин-т культуры ; сост. Н. А. Мицкевич. – Минск, 1989. – 18 с.

Театр. Эстрада. Цирк / отв. ред. С. М. Макаров. – М. : КомКнига, 2006.

*Фядотаў, А. Г.* Элементы паратэатральнай культуры беларускай шляхты ў сучасных гарадскіх святах / А. Г. Фядотаў // Музычнае і тэатральнае мастацтва: праблемы выкладання. – 2008. – № 2. – С. 48–51.

*Шамшур, В. В.* Празднества революции : организация и оформление советских массовых торжеств в Белоруссии / В. В. Шамшур. – Минск : Наука и техника, 1989. – 157 с.

*Шароев, И. Г.* Многоликая эстрада : за кулисами кремлевских концертов / И. Г. Шароев. – М. : Вагриус, 1995. – 412 с.

*Шубина, И. Б.* Организация досуга и шоу-программ. Творческая лаборатория сценариста / И. Б. Шубина. – Изд. 2-е. – Ростов н/Д : Феникс, 2004. – 351 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне**

*Мэта:* павышэнне ўзроўню прафесійнай кампетэнтнасці будучага спецыяліста праз сфармаванасць дастатковай ступені падрыхтаванасці студэнтаў да самастойнай працы.

*Задачы:*

– выпрацоўка ў студэнта навыкаў прадуктыўнай дзейнасці, інавацыйна-творчага і культуралагічнага мыслення, пазнавальных здольнасцей;

– паглыбленае вывучэнне дысцыпліны «Рэжысура тэатралізаваных прадстаўленняў і свят»;

– актывізацыя самаразвіцця і матывацыі самарэалізацыі студэнта.

У шэрагу эфектыўных педагагічных *методык і тэхналогій*, якія садзейнічаюць набыццю ведаў і вопыту самастойнага вырашэння разнастайных задач, неабходна вылучыць:

– тэхналогіі праблемнага модульнага навучання;

– камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусія, прэс-канферэнцыя, вучэбныя дэбаты);

– гульнявыя тэхналогіі, у рамках якіх студэнты ўдзельнічаюць у дзелавых, імітацыйных гульнях і інш.

Асноўныя *формы* арганізацыі самастойнай працы студэнтаў:

– экспрэс-апытанне па прачытанай лекцыі;

– падбор і вывучэнне літаратурных крыніц, падрыхтоўка тэматычных аглядаў па перыёдыцы;

– рэфераты, аналіз навуковых і навукова-публіцыстычных артыкулаў;

– падрыхтоўка да ўдзелу ў навукова-практычных канферэнцыях;

– самастойная адпрацоўка практычных навыкаў з выкарыстаннем відэаматэрыялаў;

– тэсты;

– кантрольныя апытванні, кантрольныя работы;

– пісьмовыя справаздачы па аўдыторных (дамашніх) практычных практыкаваннях;

– паказ;

– пастаноўка нумара, эцюда, спектакля.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыс-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тоўваць рэйтынгавыя крэдытна-модульныя сістэмы вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай працы, вучэбна-метадычныя комплексы.

## Рэкамендаваныя сродкі дыягностыкі вучэбнай дзейнасці студэнтаў

Метады вуснай дыягностыкі (апытанне, дыскусіі, дыспуты па ведах, атрыманых на занятках, аналіз задумы прагледжаных творчых работ).

Метады практычнай дыягностыкі (складанне і правядзенне заняткаў, удзел у агульнай справе рэпетыцыйнага працэсу гульнявой праграмы, абраду, эстрадных нумароў, тэатралізаванага прадстаўлення, свята; выкананне вучэбна-творчых заданняў выкладчыка).

Метады графічнай дыягностыкі (пісьмовая работа, рэферат, дзе змяшчаюцца рэжысёрская эксплікацыя, сцэнарны план, літаратурны сцэнарый, мізансцэнаванне дзействаў; стварэнне мультымедыйнай прэзентацыі па выбранай тэме).

Інтэрактыўныя метады дыягностыкі (творчы паказ, ролевыя гульні, сітуацыйныя задачы, выступленне на ўніверсітэцкіх, гарадскіх і рэспубліканскіх сцэнічных пляцоўках з падрыхтаванымі гульнявымі праграмамі, абрадам, эстраднымі нумарамі, тэатралізаваным прадстаўленнем, святам).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці

На аснове выкладання дысцыпліны «Рэжысура тэатралізаваных прадстаўленняў і свят» на працягу шматгадовай вучэбнай дзейнасці склалася шкала ацэнкі ведаў, уменняў і навыкаў студэнта.

**10 балаў** – надзвычайна выдатна – студэнт усебакова засвоіў тэарэтычны і практычны матэрыял праграмы, валодае вялікай працаздольнасцю і надзвычайна багатымі прыроднымі данымі для авалодання рэжысёрскай спецыяльнасцю; яго творчыя інтэрпрэтацыі ўтрымліваюць арыгінальныя ідэі і парадаксальныя мастацкія вырашэнні, яны грунтоўныя па змесце і сучасныя па форме; інтуітыўнае разуменне чалавечай псіхалогіі і прыроды творчай працы, узбагачанае ведамі і працаздольнасцю, дапамагаюць пераатварыць рэпетыцыйны працэс у сапраўдную творчую дзею, а творчы паказ – у святочную ўрачыстасць. Студэнт мае ўстойлівае жаданне бесперапынна ўзбагачаць сябе новымі ведамі, пачуццямі, жыццёвымі назіраннямі, ён з цікавасцю і з выключным творчым вынікам удзельнічае ў творчых паказах курса, факультэта і ўніверсітэта.

**9 балаў** – выдатна – студэнт мае ўсебаковыя і сістэматызаваныя веды; выканаў усе прадугледжаныя праграмай практычныя заданні; здольны ў поўнай меры праявіць творчую ініцыятыву, дасягнуў высокай ступені разумення суадносін рэжысёрскай свабоды і народнай традыцыі пры ўвасабленні розных форм народнай святочнай культуры; яго творчыя працы адрозніваюць добры мастацкі густ і вобразнае бачанне; пастаянна займаецца самавыхаваннем. Студэнт актыўна ўдзельнічае ў рэжысёрскай і выканальніцкай рабоце курса і ўніверсітэта.

**8 балаў** – амаль выдатна – студэнт добра засвоіў матэрыял праграмы і выканаў прадугледжаныя ёй заданні; веды яго сістэматызаваныя і ўстойлівыя; валодае навыкамі пабудовы мэтанакіраванага сцэнічнага дзеяння; добра ведае асновы родных творчых прафесій (літаратуры, музыкі, жывапісу, архітэктуры) і ўмее выкарыстоўваць гэтыя веды для стварэння вобразнай структуры відовішча; упэўнены і вынаходлівы ў арганізацыі творчага працэсу; здольны да самастойнай актыўнай працы па фарміраванні рэжысёрскіх навыкаў і пераадолення недахопаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**7 балаў** – вельмі добра – студэнт праявіў дастаткова поўнае веданне вучэбнага і дадатковага матэрыялу, выканаў усе заданні, рэкамендаваныя праграмай навучання, і прадэманстраваў сістэматызаваныя веды; актыўна працаваў на занятках; яго творчую работу характарызуюць веданне асноў рэжысёрскага майстэрства і самастойнасць мыслення; добра валодае навыкамі арганізацыі творчага працэсу; актыўна працуе ў паказах і канцэртах; імкнецца прымаць удзел у буйнамаштабных святочных урачыстасцях за межамі ўніверсітэта з мэтай практычнай апрабацыі вучэбных навыкаў.

**6 балаў** – добра – студэнт дастаткова поўна ведае матэрыял праграмы, актыўна працуе над выкананнем вучэбна-творчых заданняў; прымае ўдзел у практычных занятках і паказах курса, а таксама ў выступленнях ва ўніверсітэце і за яго межамі; творчую работу характарызуе імкненне да самастойнага асэнсавання і вырашэння ўзятых у пастаноўцы жыццёвых праблем; у дастатковай меры валодае навыкамі самастойнай арганізацыі і правядзення рэпетыцыйнага працэсу; рэгулярна займаецца самавыхаваннем і пашырэннем свайго творчага светапогляду.

**5 балаў** – амаль добра – студэнт выявіў веданне асноўнага і дадатковага матэрыялу ў аб'ёме, неабходным для далейшага навучання і працы па абранай спецыяльнасці; добрасумленна і сістэматычна ўдзельнічае ў паўсядзённай творчай рабоце групы; засвоіў навыкі, якія дазваляюць ажыццяўляць інтэрпрэтацыю ўвасабляемага твора ў межах аўтарскай задумы ці існуючай традыцыі, але недахоп творчай смеласці і пачуцця сучаснасці перашкаджае ў стварэнні арыгінальнага і актуальнага відовішча; валодае навыкамі арганізацыі і самастойнага правядзення творчага працэсу, дзе дысцыплінаванасць і працаздольнасць дамінуюць над арыгінальнасцю задумы і парадаксальнасцю творчага мыслення; згодна з заўвагамі выкладчыка працуе над фарміраваннем сваёй творчай асобы і набыццём неабходных прафесійных якасцей; недастаткова сфарміраваная творчая і грамадзянская пазіцыя перашкаджае студэнту ў пошуку нетрадыцыйных рашэнняў і арыгінальных задум.

**4 балы** – дастаткова здавальняюча – студэнт ведае асноўны вучэбны матэрыял, засвоіў літаратуру, рэкамендаваную праграмай, але працэс спасціжэння прафесійнага майстэрства ў яго характарызуецца нестабільнасцю, перыяды актыўнай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

працы змяняюцца творчай пасіўнасцю; студэнт не набыў устойлівага навыку мэтанакіраванай паўсядзённай работы; пры наяўнасці цікавай, творчай задумы рэпетыцыйны працэс ідзе неарганізавана, а яго творчы вынік атрымліваецца нязначны; студэнт не засвоіў навыкаў калектыўнай работы, яго перыядычная пасіўнасць дрэнна адбіваецца на творчай працы групы; малаініцыятыўны, эпізадычна прымае ўдзел у выступленнях курса, кафедры, універсітэта.

**3 балы** – здавальняюча – студэнт знаёмы са зместам асноўнага вучэбнага матэрыялу па праграме, але мае складанасці з практычным выкарыстаннем набытых ведаў; творчыя працы яго ўтрымліваюцца ў межах хрэстаматыйных паняццяў, што не дазваляе ў поўным аб'ёме раскрыць сваю творчую індывідуальнасць; не праявіў актыўнасці ў выкананні практычных заняткаў па дадзеным курсе; не ў поўнай меры авалодаў навыкамі інтэрпрэтатара абранага матэрыялу і арганізатара творчага працэсу; не праяўляе належнай ініцыятывы ў пастановачнай рабоце; дапускае памылкі ў рэпетыцыйным працэсе і ў паказах вучэбных работ; недастатковую ўвагу надае самавыхаванню і фарміраванню ў сабе неабходных рэжысёрскіх здольнасцей. Разам з тым мае імкненне да ліквідацыі памылак у працэсе авалодання прафесіяй.

**2 балы** – амаль здавальняюча – веды і практычныя навыкі студэнта маюць значныя прабелы; ён не авалодаў навыкамі стварэння рэжысёрскай задумы відовішча, вызначэння яго асноўных кампанентаў; не валодае здольнасцю вобразнага бачання відовішча ў музычным, архітэктурна-дэкаратыўным і пластычным выяўленнях; не адпрацаваў асноўныя практычныя заняткі па дадзеным курсе; не засвоіў методыкі арганізацыі творчага (рэпетыцыйнага) працэсу, не авалодаў сродкамі ўзбуджэння і ўтрымання цікавасці выканаўцаў да рэпетыцыйнай работы; у працэсе навучання не набыў якасцей будучага творчага лідара (волі, мэтанакіраванасці, творчай дысцыпліны, мастацкага густу, пастаяннага імкнення да самаўдасканалення); не ў стане пераадолець індывідуальныя (творчыя і чалавечыя) недахопы ў адпаведнасці з патрабаваннямі рэжысёрскай прафесіі.

**1 бал** – нездавальняюча – праграма па дысцыпліне студэнтам поўнасцю не выканана; адсутнічае творчы вынік (паказ). Без права пераздачы.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

# РЭЖЫСУРА
# ТЭАТРАЛІЗАВАНЫХ ПРАДСТАЎЛЕННЯЎ І СВЯТ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-17 01 05-02*
*Рэжысура свят (тэатралізаваныя)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2017. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,69. Ул.-выд. арк. 1,16. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ